Пролетарыі ўсік краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б
і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 255 (324)
СУБОТА
2
ЛІСТАПАДА
1940 г.

Цэна 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ВЫБАРЧЫ ЎЧАСТАК—ЦЭНТР АГІТАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

Прайшло ўжо больш двух тыдняў, як пачалася выбарчая кампанія па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях Беларусі. У нашай абласці ў асноўным ужо закончаны ўсе арганізацыйныя работы па стварэнню выбарчых камісій, утварэнню выбарчых акруг, участкаў, складзены папярэднія спіскі выбаршчыкаў.

Партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах, ва ўстановах, калгасах і вёсках разгарнулі вялікую агітацыйную работу сярод працоўных. Арганізаваны і працуюць сотні гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных БССР. Гэтымі гурткамі ахоплены дзесяткі тысяч рабочых, сялян і інтэлігенцыі. У Крынкаўскім раёне працуе 121 гурток, якімі ахоплена 1.175 чалавек. У Парэцкім раёне ў 83 гуртках займаецца 1.763 чалавекі. Бельскі райком партыі арганізаваў 540 гурткоў, якімі ахоплена 9.640 чалавек. Не меншая колькасць гурткоў арганізавана і працуе і ў астатніх раёнах.

Шматлікія калектывы агітатараў арганізоўваюць агітацыйную работу ў Беластоку, Гродне, Ломжы і іншых гарадах і раёнах нашай вобласці, праводзяць заняткі на кватэрах выбаршчыкаў. Агітатар 6-га беластоцкага тэкстыльнага камбіната тав. Астралогава, 13-й фабрыкі тав. Мамчыц і сотні іншых з першых дзён арганізавалі работу на выбарчых участках. Многія агітатары працуюць са сваімі выбаршчыкамі бесперапынна з часу выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі.

Але не ўсе партыйныя арганізацыі па-большэвіцку арганізавалі агітацыйную работу на выбарчых участках. Днямі ў абласным камітэце партыі адбылася нарада агітатараў горада Беластока. Сёння мы друкуем выступленні агітатараў на гэтай нарадзе. Як гэтыя выступленні, так і іншыя матэрыялы гавораць аб тым, што некаторыя партыйныя арганізацыі яшчэ не разгарнулі па-сапраўднаму агітацыйную работу на выбарчых участках. Да ліку такіх у Беластоку ў першую чаргу належаць 1, 3 і 5 камбінаты, у Гродне скурзавод № 5 і іншыя. Ёсць такія партыйныя арганізацыі ў Ваўкавыскім і ў некаторых іншых раёнах. Агітатары гэтых партыйных арганізацый вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю, Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы толькі з рабочымі і служачымі сваіх прадпрыемстваў, а на выбарчых участках, да якіх партарганізацыі ўжо даўно прымацаваны, не працуюць. Таму вялікая колькасць выбаршчыкаў з неарганізаванага насельніцтва — хатнія гаспадыні і іншыя, астаецца неахопленай агітацыйнай работай.

Ні ў якім разе нельга мірыцца з такім становішчам. Большэвіцкай агітацыяй трэба ахапіць усіх выбаршчыкаў. Цэнтрам вядзення агітацыі ў выбарчай кампаніі з'яўляецца выбарчы ўчастак. Сюды павінны быць у першую чаргу накіраваны агітатары і іх большэвіцкая агітацыйная дзейнасць. Агітатары абавязаны кожны дзень наведваць сваіх выбаршчыкаў, цікавіцца іх інтарэсамі, запатрабаваннямі і асабістым жыццём, дапамагаць выбаршчыкам у вырашэнні любых пытанняў, якія ўзнікаюць перад імі.

Зразумела, узмацненне агітацыйнай работы на выбарчых участках ніколькі не азначае, што можна паслабіць агітацыйную работу на прадпрыемствах ці ва ўстановах сярод рабочых і служачых. Наадварот, агітацыя сярод рабочых і служачых павінна быць узмоцнена.

Усё гэта патрабуе вялікай работы агітатараў, сур'ёзных адносін да справы, затраты многа часу на падрыхтоўку да заняткаў і арганізацыю выбаршчыкаў. І тут выключную дапамогу агітатарам павінны аказаць кіраўнікі агіткалектываў. Агітатар можа добра справіцца са сваёй работай толькі ў тым выпадку, калі ім добра будуць кіраваць. На семінарах у агіткалектывах агітатары павінны выражаць усе незразумелыя ім пытанні і да выбаршчыкаў ісці падрыхтаванымі.

Агіткалектывамі канкрэтна павінны кіраваць аддзелы прапаганды і агітацыі гаркомаў і райкомаў партыі, аказваць практычную дапамогу. Аднак, пакуль што нельга сказаць, каб аддзелы прапаганды і агітацыі добра кіравалі агіткалектывамі, дапамагалі ім у набыцці выбарчай літаратуры, правядзенні семінараў. Агітатар 1-га камбіната тав. Канопка, 3-га камбіната—тав. Эліна ўказваюць у сваіх выступленнях, што яны адчуваюць вялікі недахоп у выбарчай літаратуры на польскай і яўрэйскай мовах. Часта ўзнікаюць у выбаршчыкаў пытанні, на якія немагчыма адказаць без папярэдняй кансультацыі.

Выбарчая кампанія ў мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных у нашай абласці праходзіць у выключна складаных умовах класавай барацьбы. І туды, дзе з выбаршчыкамі не будуць працаваць нашы большэвіцкія агітатары, сваю дзейнасць накіруюць ворагі, рэшткі буржуазных і дробнабуржуазных партый і арганізацый. Наш большэвіцкі агітатар павінен быць у кожным доме, гутарыць з кожным выбаршчыкам.

Пачынаецца ўжо вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты. Гэта адказнейшы перыяд у выбарчай кампаніі. Выбаршчыкам трэба расказаць аб індывідуальнай адказнасці кожнага перад радзімай за вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты. Ворагі паспрабуюць вылучыць сваіх кандыдатаў, выдаючы іх за совецкіх актывістаў. І тут асабліва вострай павінна быць пільнасць працоўных. Ні адзін паслядыш буржуазных і дробнабуржуазных партый не павінен прабрацца кандыдатам у дэпутаты. Агітатары ў гэтым павінны адыграць выключна вялікую ролю. Ворагаў самым рашучым чынам трэба выкрываць перад працоўнымі. Кандыдатамі ў дэпутаты неабходна вылучаць толькі самых лепшых людзей нашых прамысловых прадпрыемстваў, лепшых калгаснікаў, сялян-актывістаў, прадстаўнікоў нашай совецкай інтэлігенцыі, як партыйных, так і непартыйных. У вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты павінен быць ажыццёўлен самы цесны блок комуністаў і беспартыйных, бо толькі кандыдаты гэтага блока з'яўляюцца кандыдатамі народа, за якіх будуць галасаваць нашы совецкія выбаршчыкі. За кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных павінны разгарнуць шырокую агітацыю нашы агітатары.

НАРАДА САКРАТАРОЎ ГК І РК КП(б)Б

1-га лістапада ў абкоме КП(б)Б адбылася нарада сакратароў ГК і РК КП(б)Б па пытанню работы партыйных арганізацый у кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На нарадзе з паведамленнямі аб прароблетай рабоце выступілі сакратары райкомаў партыі тт. Талкачоў, Зыбель, Маўчанскі, Садоўскі, Адамейка, Казачэнка.

Аб далейшых задачах арганізацыйнай і агітацыйнай работы ў выбарчай кампаніі выступілі сакратары абкома КП(б)Б тт. Кісялёў і Сямёнаў.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

3-га лістапада, у 2 гадзіны дня, у Доме партасветы (вул. Талстога, 9) склікаецца сход старшынь, намеснікаў старшынь і сакратароў участковых і акруговых выбарчых камісій горада Беластока.

ГАРАДСКАЯ ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ СОВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ



Агітатар беластоцкай табачнай фабрыкі, брыгадзір укладачнага цэха А. К. Алексейчук чытае работніцам фабрыкі Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Фота А. Сапіра.

ІНТЭЛІГЕНТЫ СЯЛА ПРАЦУЮЦЬ АГІТАТАРАМІ

КНЫШЫН. (**Ад нашага карэспандэнта**). У сувязі з пачаткам выбарчай кампаніі райком партыі значна палепшыў работу з інтэлігенцыяй Монькаўскага раёна. У раённым цэнтры рэгулярна праводзяцца семінары, гутаркі і лекцыі.

Нядаўна праведзена нарада інтэлігенцыі, на якой загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі райкома партыі тав. Васкаўцоў зрабіў даклад на тэму: «Ленінска-сталінскае вучэнне аб інтэлігенцыі». Затым сабраўшыяся з вялікай зацікаўленасцю праслухалі папулярную лекцыю доктара біялагічных навук тав. Дарошкіна — «Дарвінізм і дасягненні совецкай біялогіі».

На апошняй нарадзе інтэлігенцыі раёна абмеркаваны пытанні агітацыйнай работы. На нарадзе агітатары і прапагандысты абмяняліся вопытам сваёй работы. Яны адзначылі, што вялікім тормазам у іх рабоце з'яўляецца адсутнасць выбарчай літаратуры. Усяго па раёну ў актыўную прапагандысцкую работу ўключылася звыш 120 настаўнікаў, урачоў, аграномаў, работнікаў хат-чытальнень.

КАМІСІІ ПРЫСТУПІЛІ ДА РАБОТЫ

Беластоцкая акруговая выбарчая камісія № 124, старшынёй якой з'яўляецца тав. Вінецкі, адразу аператыўна прыступіла да сваёй пачатнай работы.

Учора праведзена першае арганізацыйнае пасяджэнне. Члены камісіі ўключаюцца ў работу з вялікай энергіяй і актыўнасцю.

Па распрацаванаму плану работы ў бліжэйшы час намечана правесці сходы хатніх гаспадынь, моладзі, старыкоў. Вакол камісіі ствараецца актыў выбаршчыкаў.

Прыступлена да абсталявання і ўпрыгожання памяшкання выбарчых участкаў, устанаўліваецца дзяжурства членаў камісіі.

Д. Пецярэнка.

ВЫТВОРЧЫМІ ПАДАРУНКАМІ РАДЗІМЕ СУСТРЭНЕМ XXIII ГАДАВІНУ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

У чэсць свята

Калектыў 2-га тэкстыльнага камбіната, штодня паляпшаючы свае поспехі, набліжаецца да выканання гадавой вытворчай праграмы. Стаханаўскія вахты, якія пачаліся ў чэсць слаўнай гадавіны Вялікага Кастрычніка, усё больш і больш ахапляюць рабочых. Першы раз стаханаўская вахта была праведзена сярод прадзільшчыкаў. Вынікі атрымаліся выдатныя. Ткачы, стаўшыя на вахце, паказалі ўзоры высокай прадукцыйнасці працы.

31 кастрычніка на чарговую стаханаўскую вахту заступіў трэці корпус ткацкага цэха. І на гэты раз ткачы, не жадаючы адстаць ад сваіх таварышоў, паказалі выдатныя паказчыкі ў сваёй рабоце. Асабліва добра папрацавалі ткачы-двухстаночнікі. Ткач-двухстаночнік І. Жоландзь у дзень стаханаўскай вахты выканаў праграму на 135 процантаў. Другі ткач тав. Баруховіч выканаў сваю норму выпрацоўкі на 129 процантаў. Усе 24 чалавекі, працаваўшыя ў гэты дзень на стаханаўскай вахце, значна перавысілі свой план. Сярэдняя выпрацоўка на аднага ткача складае 118—120 процантаў.

Спаборніцтва дыспетчараў

Паміж дыспетчарамі Беластоцкага і Ваўкавыскага аддзяленняў чыгункі разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу XXIII гадавіны Кастрычніка. Дыспетчарскія калектывы двух аддзяленняў змагаюцца за няўхільнае выкананне загада № 259/ц, за выкананне плана выгрузкі на 115 процантаў і плана пагрузкі на 110 процантаў, за стопроцантнае выкананне рэгуліровачнага задання па здачы парожняка.

На чале спаборніцтва ідуць дыспетчары-стаханаўцы тт. Булачоў, Пятроў, Фёдарава (Беластоцкае аддзяленне) і тт. Ефімцаў і Катляроў (Ваўкавыскае аддзяленне). Яны добра арганізавалі прасоўванне мясцовага груза, выкананне рэгуліровачнага задання, значна паскорылі абарот вагонаў.

ПЛАН ВЫКАНАН ДАТЭРМІНОВА

Рабочыя гродненскага табачна-ферментацыйнага завода рыхтуюць дастойную сустрэчу XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Сярод калектыва рабочых шырока разгорнута перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва. План за кастрычнік выканан датэрмінова.

Асобныя рабочыя паказваюць узоры высокапрадукцыйнай працы. Так, рабочыя Беркоўскі, Церабей, Ярашэвіч сістэматычна выконваюць нормы выпрацоўкі на 150 процантаў.

Старшы сартыроўшчык тав. Ласкавой унёс рацыяналізатарскую прапанову. Ён прапанаваў укладваць махорку ў мяшкі замест прасоўкі. Гэта дасць заводу звыш 5 тысяч рублёў прыбытку ў год.

Перавыконваюць нормы

Уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, калектыў гродненскай слясарна-механічнай майстэрні абавязаўся да 7 лістапада выканаць гадавы вытворчы план. Свае абавязацельствы рабочыя выконваюць. Кастрычніцкі план выканан датэрмінова.

Электразваршчык майстэрні Арэміновіч выконвае заданне на 200 процантаў. Добрыя ўзоры работы паказвае ліцейшчык тав. Каспер і вагранщчык тав. Буцько. Стаханаўцы Пацэнка, Ражко і іншыя перайшлі на абслугоўванне двух станкоў. Яны выконваюць нормы выпрацоўкі на 150 процантаў.

Перавыконваюць заданне

Калектыў станцыі Беласток дзейна рыхтуецца да вялікага свята—XXIII гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Рабочыя і служачыя сустракаюць свята новымі вытворчымі перамогамі. Месячнае заданне пагрузкі за кастрычнік выканана датэрмінова.

Да 28 кастрычніка пагружана звыш плана 65 вагонаў грузаў першай катэгорыі. Значна зніжан прастой вагонаў.

Па Совецкай краіне



Жылыя дамы рабочых і служачых хімкамбіната імені Сталіна ў гор. Сталінагорску (Тульская вобласць).
Фота А. Есаулава.

Фота ТАСС.

208 ТОН ВУГАЛЮ ЗА ЗМЕНУ

ТУЛА. Забойшчык - скараснік шахты № 2 «Узлоўская» Павел Пендзюрын устанавіў новы рэкорд прадукцыйнасці працы, нарубіўшы за змену 208 тон вугалю, што складае 825 процантаў задання. Гэта—сутачная дабыча невялікай шахты Падмаскоўнага басейна.

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ Ў КАРЭЛА-ФІНСКАЙ ССР І ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЯХ УКРАІНЫ

ПЕРШЫЯ КАНДЫДАТЫ

ПЕТРАЗАВОДСК. У гарадах і раёнах Карэла-Фінскай рэспублікі на многалюдных сходах рабочых і калгаснікаў пачалося вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў. З вялікім уздымам прайшоў сход у вёсцы Ужэсельга, Прыонежскага раёна.

Увечары, пасля работы, у прасторнай хаце тав. Цімоева сабраліся калгаснікі арцелі імені Трэцяй пяцігодкі.

Калгаснік тав. Мартынаў заявіў:

— Я вылучаю кандыдатам у дэпутаты раённага Совета старшыню нашага калгаса Анну Антонаўну Арлову. Старшынствуе яна ў нас з 1936 года. Мы добра ведаем яе. Тав. Арлова ўмела кіруе арцеллю, клапоціцца аб нас і дастойна высокага давер'я. Калгас імені Трэцяй пяцігодкі дабіўся надрэнных рэзультатаў. Вялікая роля ў гэтым належыць старшыні калгаса т. Арловай.

Выступалі і іншыя калгаснікі. Аднагалосна рашана вылучыць кандыдатам у дэпутаты Прыонежскага раённага Совета па Соўгаснай акрузе № 14 Анну Антонаўну Арлову.

Брыгадзір тав. Цімоеў ад імені калгаса прапанаваў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Дзеравянскага сельсовета Анастасію Аляксееўну Косціну. Яго прапанову горача падтрымалі ўсе выбаршчыкі.

* * *


ЛЬВОЎ. На многалюдных сходах калектываў прадпрыемстваў і ВНУ пачалося вылучэнне кандыдатаў у Львоўскі абласны Совет дэпутатаў працоўных.

У Дзяржаўным універсітэце імені І. Франко аднагалосна вылучан кандыдатам у дэпутаты Львоўскага абласнога Совета прафесар І. П. Крыпакевіч. На сходзе ў Медыцынскім інстытуце аднадушна вылучана кандыдатура вядомага вучонага прафесара Я. О. Парнаса. Калектыў фабрыкі імені Кірава вылучыў кандыдатуру дырэктара фабрыкі І. П. Обедняка.

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты абласнога Совета адбылося і на іншых прадпрыемствах Львова.

Па ўсёй вобласці закончана арганізацыя ўчастковых выбарчых камісій. Зараз паўсямесна складаюцца папярэднія спіскі выбаршчыкаў.

Агітмасавую работу ў вобласці вядуць 25.330 агітатараў. 420 тысяч выбаршчыкаў вывучаюць у гуртках сталінскі выбарчы закон.



Новыя буравыя скважыны на промысле Шубар-Кудук трэста «Акцюбнафта» (Казахская ССР).
Фота Б. Кудраўцава.

Фота-кліша ТАСС.

ПЕРШЫЯ ДНІ ЎСЕСАЮЗНАГА СПАБОРНІЦТВА НАФТАВІКОЎ

БАКУ. На ўсіх промыслах азербайджанскай нафтавай прамысловасці шырока разгарнулася ўсесаюзнае спаборніцтва нафтавікоў.

Паводле даных «Азнафтакамбіната», лепш за ўсіх працавалі перадавыя трэсты: «Орджанікідзенафта», «Сталіннафта», «Кіраўнафта».

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Пакончыць з абыякавасцю да ідэйна-тэарэтычнай вучобы

За два годы пасля выхаду ў свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» значная колькасць комуністаў ужо даўно закончыла вывучэнне гэтага выдатнага падручніка. Многія з іх вывучылі рад твораў Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна.

Тав. Волкаў, сакратар пярвічнай партарганізацыі Беластоцкага горвыканкома, паказвае асабісты прыклад у глыбокай тэарэтычнай вучобе. Ён даўно закончыў вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» і паспеў ужо добра вывучыць такія работы Леніна, як «Дзве тактыкі соцыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэволюцыі», «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць соцыял-дэмакратаў», «Што рабіць?» і «Да крытыкі палітычнай эканоміі»—Маркса. Тав. Волкаў рэгулярна чытае партыйныя журналы.

Настойліва працуючы над сабой, тав. Волкаў патрабуе таго-ж самага ад комуністаў сваёй партарганізацыі. Ён часта гутарыць з членамі партыі, правярае, як хто вывучыў і засвоіў матэрыял, раз'ясняе незразумелыя пытанні.

Тав. Шпілёў з партарганізацыі горвыканкома вывучыў «Кароткі курс» і зараз вывучае асобныя творы класікаў марксізма-ленінізма. Ён вывучыў ужо рад твораў Леніна і іншыя. Тав. Сафонаў (з партарганізацыі НКВД), гаворачы аб тэарэтычнай вучобе, расказаў, што ён, з выхадам у свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» бегла прачытаў яго, затым вывучыў і заканспектыраваў. Зараз ён працуе ў трэці раз над «Кароткім курсам», карыстаючыся першакрыніцамі твораў, указаных у падручніку.

Тав. Сарокін з партарганізацыі чыгуначнай міліцыі вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» закончыў яшчэ ў 1939 годзе. З таго часу ён вывучыў вялікую колькасць марксісцка-ленінскіх твораў. Зараз ён працуе над вывучэннем гісторыі СССР, новай гісторыі і гісторыі сярэдніх вякоў. Многа чытае мастацкай літаратуры—творы Л. Талстога, М. Горкага, гістарычную літаратуру.

Але нельга падобнае сказаць пра іншых комуністаў. Для многіх яшчэ характэрна надзвычайная марудлівасць у вывучэнні «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», многія «сядзяць» над другім, трэцім і чацвертым раздзеламі падручніка. «Кароткі курс» вывучаецца несістэматычна, у выніку выяўляецца слабае веданне асноўных пытанняў гісторыі партыі.

Комуніст партарганізацыі суда і пракуратуры тав. Вінаградаў вывучае, як ён гаворыць, IV раздзел, але ў гутарцы з ім выявіў няведанне асноўных пытанняў з пройдзеных ім раздзелаў.

Тав. Зубовіч з партарганізацыі аблвыканкома ўжо 8 месяцаў не вывучае «Кароткага курса» і сам прызнаў, што ён дрэнна ведае асноўныя пытанні і этапы гісторыі партыі. Ён скардзіцца на цяжкасці ў вывучэнні «Кароткага курса», а між тым лекцыі, даклады, кансультацыі наведвае рэдка. Тав. Гутман з той-жа партарганізацыі вывучае чацверты раздзел «Кароткага курса», але па пройдзеных трох раздзелах цвёрдых ведаў не мае.

Дрэнна працуе над павышэннем свайго тэарэтычнага ўзроўню партыйны і гаспадарчы актыў. Дырэктар трэста хлебапячэння тав. Пятлякоў на пытанне аб рабоце над сабой спакойна адказаў, што год назад ён вывучаў чацверты раздзел падручніка, а зараз вывучэннем «Кароткага курса» не займаецца. На пытанне аб разнагалоссях на другім з'ездзе РСДРП адказваць адмовіўся, а пра памылкі народнікаў даў блытаны адказ.

Дырэктар скурзавода № 1 тав. Уцеха роўна год як не браў у рукі «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Тав. Уцеха адкрыта прызнаўся, што «час для работы над сабой ёсць, але не займаюся, у нас ніхто не правярае, таму і адказнасці ніякай не адчуваеш. Таварыскіх субяседванняў партарганізацыя не праводзіць, сакратар партарганізацыі з комуністамі не гутарыць».

Сакратар партарганізацыі 5-га тэкстыльнага камбіната тав. Глухоўскі вывучае, як ён гаворыць, пяты раздзел «Кароткага курса», але веды ў яго слабыя. На пытанне аб прычынах паражэння рэволюцыі 1905 года адказаў — «не ведаю».

Начальнік абласной канторы «Загатзярно», ён-жа сакратар партарганізацыі тав. Ісайчэнка не помніць, калі браў у рукі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Ён тлумачыць гэта празмернай перагружанасцю. На пытанне, як-жа ён працуе і кіруе партарганізацыяй, тав. Ісайчэнка не без гордасці сказаў: «У мяне для гэтага ведаў хопіць. Асноўныя-ж пытанні з гісторыі партыі я ведаю». А калі яго спыталі, што такое НЭП, то аказалася, што правільнага разумення НЭПА ён не мае, зусім не ведае палітыку ваеннага комунізма.

Характэрна, што там, дзе партыйныя кіраўнікі самі не працуюць над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню, там партыйная прапаганда, як правіла, кульгае. У партыйных арганізацыях, дзе сакратарамі з'яўляюцца вышэй названыя тт. Глухоўскі і Ісайчэнка, комуністы да гэтага часу сядзяць над першымі раздзеламі «Кароткага курса».

Ёсць і такія комуністы, якія вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» закончылі яшчэ ў мінулым годзе і ў пачатку бягучага года, але да гэтага часу не прыступілі да работы над творамі Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна. Сакратар партарганізацыі тэкстыльнага трэста тав. Галкін закончыў вывучэнне «Кароткага курса» у маі і з таго часу не прачытаў ніводнага твора класікаў марксізма-ленінізма. Дырэктар 2-га камбіната тав. Янчук даўно закончыў работу над «Кароткім курсам гісторыі ВКП(б)», а да вывучэння першакрыніц яшчэ не прыступіў, аб'ясняючы гэта перагружанасцю ў рабоце.

Вялікую дапамогу ў вывучэнні гісторыі партыі аказвае Дом партыйнай асветы. Работнікі Дома партасветы шырока практыкуюць кансультацыі на прадпрыемствах, у пярвічных партыйных арганізацыях. Пры Доме часта чытаюцца лекцыі, даклады. Неабходна, каб комуністы горада выкарысталі ўсе гэтыя мерапрыемствы для вывучэння гісторыі партыі.

Для сакратароў пярвічных партарганізацый створан семінар, які склікаецца тры разы ў месяц па асобных пытаннях асноў марксізма-ленінізма. Сакратарам партарганізацый трэба строга ўстанавіць кантроль над тым, як комуністы займаюцца палітычнай самаадукацыяй. На аснове запросаў комуністаў часцей праводзіць таварыскія субяседванні. Пытанні партыйнай асветы ставіць на партсходах, ствараючы грамадскую партыйную думку вакол тых, якія не жадаюць павышаць свой ідэйна-тэарэтычны ўзровень. Мы маем рад партарганізацый, якія ніколі не ставілі на партсходах пытанняў партыйнай прапаганды (аблканторa «Загатзярно», трэст бузматэрыялаў, мясакамбінат, тэкстыльны трэст і іншыя).

Пара пакласці канец такім абыякавым адносінам да справы партыйнай асветы. Трэба памятаць, што авалодаўшы тэорыяй марксізма-ленінізма, якая ўзбройвае веданнем законаў грамадскага развіцця, нашы кадры стануць сапраўды непераможнымі і яшчэ больш паспяхова павядуць пад сцягам гэтай тэорыі, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ўвесь совецкі народ да перамогі комунізма.

А. Міронава,
інструктар аддзела прапаганды і агітацыі Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

РАЁННЫ ПАРТЫЙНЫ СХОД У ЗАМБРАВЕ

У Замбраве адбыўся агульны партыйны сход раёна.

Сход абмеркаваў справаздачны даклад сакратара райкома партыі тав. Татарава, які паведаміў, што раённая партарганізацыя за 6 месяцаў правяла вялікую палітыка-выхаваўчую работу сярод працоўных. У выніку план хлебапаставак у раёне выканан поўнасцю і своечасова.

Поўнасцю падабраны і ўкамплектаваны з ліку лепшых людзей выбарчыя камісіі. Комуністы разам з беспартыйным актывам разгарнулі работу на выбарчых участках. Удакладняюцца спіскі выбаршчыкаў, абсталёўваюцца памяшканні ўчастковых выбарчых камісій.

Удзельнікі раённага партсхода падвергді рэзкай крытыцы райком КП(б)Б за недастатковае правядзенне работы з кандыдатамі партыі. У раёне ёсць нават кандыдат партыі т. Гарошка (партарганізацыя кааператыўна-загатоўчых устаноў), які з'яўляецца кандыдатам з 1931 года. Тры кандыдаты прайшлі 7—8-гадовы стаж. Многія кандыдаты партыі да апошняга часу не маюць партыйных даручэнняў.

Сакратар пярвічнай партарганізацыі кааператыўна-загатоўчых устаноў тав. Манулік работай з кандыдатамі не цікавіцца. Той-жа самы кандыдат тав. Гарошка ніколі не атрымлівае партыйных даручэнняў. Не маюць партыйных даручэнняў кандыдаты партыі тт. Маркоўскі, Прылуцкі. і іншыя ў арганізацыі раённага аддзялення міліцыі.

У радзе пярвічных партарганізацый адсутнічае праверка выканання партыйных даручэнняў. У партарганізацыях кааператыўна-загатоўчых устаноў, пракуратуры і суда пытанні праверкі выканання ні аднаго разу не абмяркоўваліся на сходах.

Агульны партсход раёна прыняў разгорнутае рашэнне, у якім намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па ліквідацыі ўскрытых недахопаў у рабоце райкома і пярвічных арганізацый.

С. Сенцюраў,
інструктар абкома КП(б)Б.



У аўгустоўскім парткабінеце сістэматычна праводзяцца індывідуальныя кансультацыі па гісторыі партыі.

На здымку: тав. О. Ф. Чаркоўская (загадчык аддзела агітацыі і прапаганды Аўгустоўскага райкома КП(б)Б) кансультыруе члена партыі тав. П. А. Рэйліка.

Фота А. Сапіра.

З чым сустракаюць гадавіну кастрычніка работнікі літаратуры і мастацтва

4-га кастрычніка 1939 года палітасветаддзел Часовага ўпраўлення горада Беластока склікаў першы сход мастакоў. У сваіх выступленнях мастакі гаварылі аб дарэмна патрачаных гадах у беспрасветным змроку буржуазна-памешчыцкай Польшчы.

Мінуў год. Па вялікім творчым шляху паспяхова ідуць нашы мастакі і артысты, пісьменнікі і кампазітары. Вялікая наша радзіма акружыла ласкай і клопатамі новы атрад работнікаў літаратуры і мастацтва, стварыла ўсе ўмовы для росквіту іх творчых сіл і дараванняў.

У дні падрыхтоўкі да гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі небескарысным будзе падвесці некаторыя ітогі творчага года ў нашай вобласці.

I. СЯРОД ПІСЬМЕННІКАЎ

Беласток не меў літаратурных традыцый. Зараз у Беластоку створана буйнейшая ў БССР (пасля Мінска) пісьменніцкая арганізацыя. Беластоцкае аддзяленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР еднае 20 членаў саюза і значную колькасць здольных пісьменнікаў, паэтаў і крытыкаў, якія яшчэ не прыняты ў члены саюза.

З прыняццем у члены саюза новых пісьменнікаў беларуская совецкая літаратура ўзбагацілася такімі імёнамі, як Філіп Пестрак, Максім Танк, Міхась Машара, Анатоль Іверс.

Паэт-рэволюцыянер Філіп Пестрак ва ўмовах панскай Польшчы не меў магчымасці друкаваць свае творы. Больш адзінаццаці год польскі ўрад трымаў паэта ў турэмных засценках. За чытанне рэволюцыйных вершаў Пестрака арыштоўвалі і кідалі ў турму. Цяпер буйны паэтычны талент Пестрака атрымаў усе магчымасці для творчага росту. Дзяржаўнае выдавецтва пры Соўнаркоме БССР выдала першую кнігу паэта — зборнік вершаў «На варце». Філіп Пестрак напісаў рад новых твораў па совецкую тэматыку, у якіх поўным голасам вітае свой «Першы май», гераічную Чырвоную Армію—вызваліцельніцу.

Таленавіты беларускі паэт Максім Танк, які таксама прайшоў суровую этапную дарогу ў былой панскай Польшчы, гадавіну Вялікага Кастрычніка сустракае значнымі творчымі дасягненнямі. Ён аднавіў першапачатковыя тэксты сваіх вершаў, скалечаных панскай цэнзурай, і выдаў іх асобным зборнікам. За год жыцця пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі Максім Танк напісаў літаратурны кіносцэнарый «Бура над Нараччу», у якім уваскрашае гераічную барацьбу нарачанскіх рыбакоў супроць белапольскіх акупантаў.

Побач з напісаннем лірычных вершаў Максім Танк працягвае працаваць над вялікім літаратурным палатном—эпічнай паэмай з жыцця працоўных Заходняй Беларусі пад панскім ботам. У сучасны момант Максім Танк працуе над перакладам на беларускую мову вершаў вялікага паэта польскага народа Адама Міцкевіча.

Удзельнік вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь беларускі паэт Пімен Панчанка падрыхтаваў да друку новы зборнік вершаў, якія сведчаць аб далейшым творчым росце таленавітага паэта.

Паспяхова працуюць над новымі вершамі паэты Міхась Машара, Цімох Крысько, Анатоль Іверс, маладая паэтэса Сэф'я Лісоўская.

У члены саюза совецкіх пісьменнікаў БССР прынята група польскіх пісьменнікаў Беластока, сярод якіх вядомая дзіцячая пісьменніца Яніна Бранеўская, маладыя пісьменнікі Альфрэд Дэгаль і Юрый Равіч.

У перакладзе на беларускую мову ўжо вышла з друку аповесць Яніны Бранеўскай «Вандраванні меднага грошыка», а таксама брашура для польскіх настаўнікаў. Ёю-ж напісан новы кіносцэнарый. Вышаў з друку зборнік апавяданняў польскай пісьменніцы Елены Сельм «Дзень учарашні». Елена Сельм закончыла таксама новую аповесць аб лёсе жанчыны ў капіталістычных умовах «Я, ты і ўвесь свет». Плённа працуюць над новымі вершамі польскія паэты К. Ансельм, Т. Главацкі, Ю. Равіч і інш.

Шматлікай з'яўляецца група яўрэйскіх пісьменнікаў Беластока. Адзінаццаць лепшых з іх прыняты ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, у тым ліку вядомыя яўрэйскія пісьменнікі і паэты Эфраім Кагапоўскі, Зільбург, Берлінскі, Гелер, Рубінштэйн і інш.

У маскоўскім выдавецтве «Дэр эмес» вышла з друку кніга беластоцкага яўрэйскага паэта Ш. Жырмана—«За кратамі». Знаходзяцца ў друку кнігі беластоцкіх празаікаў Катаноўскага, Берлінскага, Окрутнага, Зільбурга, Бурштына, паэтаў Гелера, Кнапгайса, Рубінштэйна, Янасовіча, Эміота і інш. Год жыцця ў Совецкім Саюзе быў плённым для яўрэйскіх пісьменнікаў і паэтаў. Новыя аповесці напісалі Зільбург і Бурштын, рад цікавых навел і апавяданняў з совецкай рэчаіснасці напісаў Берлінскі, новую паэму аб бамбардыроўцы Варшавы закончыў паэт Гелер, над новымі раманамі з жыцця лодзінскага пролетарыята працуе празаік Окрутны. У адным з гэтых раманаў паказваецца лодзінскі рабочы-рэволюцыянер Тойве Айзн, які загінуў у барацьбе за рэспубліканскую Іспанію. Новы цыкл вершаў на совецкую тэматыку закончыў паэт Рубінштэйн.

Упершыню беластоцкія пісьменнікі зрабілі вопыт калектыўнай працы. Выпушчан літаратурны зборнік «На вызваленай зямлі», у якім прынялі ўдзел беларускія, польскія, яўрэйскія і рускія пісьменнікі і паэты.

Такі, коратка, творчы год беластоцкіх пісьменнікаў.

Т. Лясовіч.

Рэволюцыйны рух ў Беластоцкім павеце у 1905 годзе

(Па архіўных матэрыялах)

Расстрэл рабочых 9 студзеня 1905 года ў Пецярбургу знайшоў жывы водгук у прамысловых цэнтрах Расіі. «К восені 1905 года рэволюцыйны рух ахапіў усю краіну» («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 73), у тым ліку і раёны Беластоцкага павета.

Што з сябе прадстаўляў тады Беласток?

У канцы XIX века ён стаў значным прамысловым цэнтрам, у якім была развіта галоўным чынам суконна-тэкстыльная прамысловасць. Ішла канцэнтрацыя прамысловасці. У 1913 годзе ў Беластоку на 272 фабрыках і заводах (сюды ўваходзяць і дробныя саматужныя прадпрыемствы з колькасцю рабочых па 10—15 чалавек) працавала 5.250 чалавек; з іх — на 15 фабрыках колькасць рабочых складала 2.149 чалавек. Гадавы абарот гэтых 15 фабрык складаў 1.703.033 рублёў і перавышаў абарот астатніх сумесна ўзятых — 1.450.110 рублёў.

Велізарнае значэнне для развіцця Беластока мае адкрыццё Варшаўска-Пецербургскай чыгункі ў 1862 годзе, праз якую ён быў звязан з прамысловымі цэнтрамі Расіі.

Умовы працы на беластоцкіх фабрыках, а таксама і на чыгунках былі вельмі цяжкія. 14—16-гадзінны рабочы дзень, нізкая заработная плата, накладанне штрафаў на рабочых, грубыя адносіны з боку фабрыканта былі звычайнымі з'явамі.

У Беластоку, які ўваходзіў з 1842 года ў састаў Гродненскай губерні, як у прамысловым цэнтры, у 1905 годзе для падаўлення рэволюцыйнага выступлення рабочых назначаецца самастойны беластоцкі часовы генерал-губернатар. У якасці такога генерал-губернатара назначаецца начальнік 16 пяхотнай дывізіі генерал-лейтэнант Багаеўскі.

Указам губернатара ад 4 верасня 1905 г. Беласток і Беластоцкі павет аб'яўляюцца на ваенным становішчы. 10 верасня ў горадзе ўзмацняецца ахова і 14 верасня выдаецца абавязковая пастанова «для фабрык і заводаў г. Беластока і Беластоцкага павета», якая заклікае бязлітасна распраўляцца з усякімі рабочымі выступленнямі.

Усе гэтыя мерапрыемствы не маглі затрымаць выступлення рабочых. Пад уплывам агульнага ўздыму рэволюцыі ў Расіі з кастрычніка падымаецца хваля актыўных забастовак і палітычных дэманстрацый. Забастоўкі на радзе прадпрыемстваў праходзяць адначасова.

У кастрычніку пачалася забастоўка рабочых чыгункі і майстэрань дэпо. 13 кастрычніка спыніўся рух на ўсіх чыгунках Беластоцкага вузла. Адначасова на ст. Беласток і іншых участках распаўсюджвалася пракламацыя «Таварышы-салдаты», якая заклікала да «знішчэння ваенных судоў, спынення вобыскаў у казармах і пасылкі войск на супакаенне рабочых, сялянскіх і салдацкіх хваляванняў, вызвалення ўсіх арыштаваных па палітычных справах, свабоды сходаў» (Гродненскі архіў, фонд часовага беластоцкага генерал-губернатара).

У знак салідарнасці да іх далучыліся рабочыя тэкстыльных фабрык, рабочыя друкарань і іншых прамысловых устаноў. «Работы на фабрыках, заводах і іншых прамысловых установах спыніліся». (Гродненскі архіў, фонд канцылярыі часовага беластоцкага губернатара). 15 кастрычніка ў многіх дзяржаўных і навучальных установах адбываліся мітынгі і дэманстрацыі.

Наколькі актыўнымі былі выступленні рабочых, відаць з таго, што для падаўлення забастоўкі чыгуначных рабочых быў паслан з Варшавы спецыяльна чыгуначны батальён. Для падаўлення забастоўкі рабочых друкарань патрабавалася цэлая рота салдат.

З прычыны таго, што чыгуначная забастоўка выклікала сур'ёзную небяспеку, насмерць перапалоханы губернатар тэрмінова склікаў 16 кастрычніка нараду фабрыкантаў і чыноў паліцыі, на якой абмяркоўвалася пытанне аб устанаўленні аховы, аб прыняцці ўсіх мер для падаўлення рэволюцыйнага руху.

16 кастрычніка навучаючыяся Беластоцкага камерцыйнага вучылішча прад'явілі да дырэктара рад патрабаванняў, у тым ліку «утварыць сходку для абмеркавання хвалюючых пытанняў». На адмову дырэктара навучаючыяся адказалі дэманстрацыяй і вулічным шэсцем. Абмеркаваўшы гэта пытанне, педагагічны совет пастанавіў, што гэтыя падзеі «з'яўляюцца вынікам агульнага настрою ў Расіі і тэлеграфных звестак аб забастоўках у многіх навучальных установах, камітэт пастанавіў часова закрыць вучылішча». (Там-жа).

Кастрычніцкая ўсеагульная забастоўка паказала сілу і магутнасць пролетарскага руху. Прамым водгукам яе быў рэволюцыйны рух на акраінах, у тым ліку і ў заходніх губернях Расіі.

Рабочы клас, кіруемы партыяй большэвікоў, не мог задаволіцца абяцанымі свабодамі і «канстытуцыяй 17 кастрычніка». Усе выступленні ў Беластоку на фабрыках ідуць пад лозунгамі: «Далоў самадзяржаўе!».

Адбыўшаяся ў Беластоку дэманстрацыя, з удзелам звыш тысячы рабочых, у дзень апавяшчэння маніфеста канчаецца расстрэлам рабочых. Рабочыя акружылі турму і прабавалі разбіць турэмныя вароты. На дапамогу мясцовым гарнізонам спешна былі выклікапы 4 роты салдат Уладзімірскага і Казанскага палкоў. Было многа забітых і раненых салдат.

Вестка аб расстрэле рабочых хутка распаўсюдзілася не толькі па г. Беластоку, але і па ўсёй губерні. 18 кастрычніка адбыліся забастоўкі, дэманстрацыі ва ўсіх навучальных установах, у тым ліку ў Пушкінскім чатырохкласным вучылішчы, жаночай і яўрэйскай гімназіях і іншых. У той-жа дзень на пахаванне забітых рабочых у час дэманстрацыі 17 кастрычніка сабралося некалькі тысяч рабочых, служачых і навучаючыхся.

20 кастрычніка ў мястэчку Гарадку (Беластоцкі павет) рабочыя суконных фабрык і мясцовыя сяляне колькасцю звыш 1.500 чалавек, сабраўшыся на дэманстрацыю з лозунгамі «Няхай жыве соцыялізм», «Далоў самадзяржаўе!»—шэсцвавалі па вуліцах з спяваннем рэволюцыйных песень. Па дэманстрантах паліцэйскія адкрылі ўраганны агонь, у выніку чаго было забіта некалькі чалавек. 23 кастрычніка дэманстрацыя і мітынгі таксама праходзяць у Аўгустове пад кіраўніцтвам соцыял-дэмакратычнай партыі. Падобныя выступленні былі ўсюды.

Такім чынам «Кастрычніцкая палітычная забастоўка стала ўсерасійскай, ахапіўшы амаль усю краіну, аж да самых аддалёных раёнаў»... («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», стар. 74).

У снежні 1905 года забастоўка ўзмацнілася. З дэпартамента паліцыі на імя Беластоцкага генерал-губернатара 29 снежня 1905 года быў пасланы спецыяльны сакрэтны цыркуляр для кіраўніцтва па падаўленню паўстанняў, у якім указваецца:

«1. Зараней высніць і арыштаваць кіраўнікоў і зачыншчыкаў хваляванняў на фабрыках і заводах.

2. Канчаткова расстроіць і знішчыць так званыя «стачачныя камітэты на чыгунках».

3. Не дапускаць ні так званых мітынгаў, ні шэсцяў, ні іншых дэманстрацый і самым рашучым чынам рассейваць усякія публічныя зборышчы».

(Там-жа, справа № 6а).

Аднак рабочыя і сялянскія выступленні ў Беластоцкім павеце мелі месца і ў 1906 г. Так, напрыклад, 17 студзеня 1906 г. адбылася забастоўка на суконнай фабрыцы ў Хорашчы. Значная частка рабочых была арыштавана і пасаджана ў турму. Беластоцкая паліцыя ў пачатку 1906 года ліквідуе ў вёсцы Беластачане падпольную друкарню соцыял-дэмакратычнай партыі.

Рэволюцыя 1905 года скончылася паражэннем, але ўрокі яе далі свае рэзультаты. Рабочы клас і сялянства пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў прайшлі суровую школу класавай барацьбы. Улічыўшы ўрок 1905 г., рабочы клас пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ўзяў уладу ў свае рукі ў кастрычніку 1917 года і ўстанавіў дыктатуру пролетарыята.

Ф. Аляксандраў.

Ў АБКОМЕ ПАРТЫІ АДБЫЛАСЯ НАРАДА АГІТАТАРАЎ ГОРАДА БЕЛАСТОКА.

Ніжэй друкуем выступленні агітатараў

ВЫБАРШЧЫКІ ЗАДАЮЦЬ МНОГА ПЫТАННЯЎ

(З выступлення агітатара чыгункі тав. Сальмановіча).

Я сваю работу агітатара пачаў з вывучэння даклада таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі. Работу праводжу сярод рабочых вакзала. Кожныя 2—3 дні збіраем людзей для вывучэння матэрыялаў. Сталінскую Канстытуцыю мы ўжо вывучылі. Цяпер пачнем вывучаць Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На занятках рабочыя і служачыя задаюць многа пытанняў: «Што такое тайнае галасаванне?», «Якая колькасць дэпутатаў будзе выбірацца?» і іншыя. Яўка на заняткі добрая. Таварышы, якія іншы раз адсутнічаюць па ўважлівай прычыне, стараюцца трапіць на наступныя заняткі. Праводзім сістэматычную чытку газет. На заняткі з'яўляюцца не толькі рабочыя нашай змены, але прыходзяць і рабочыя другіх змен.

ГАРКОМ ПАВІНЕН КІРАВАЦЬ АГІТКАЛЕКТЫВАМІ

(З выступлення агітатара 3-га камбіната тав. Елінай).

Фармальна ў нас ёсць вялікі агіткалектыў (каля 30 чалавек), а фактычна працуе толькі 12 чалавек.

Не гледзячы на гэта ўсе цэхі нашага камбіната ахоплены масава-выхаваўчай работай. У час абедзенага перапынку праводзім гутаркі з рабочымі па актуальных пытаннях. Гутаркі прадаўжаюцца прыкладна 20—30 мінут.

Быў у нас вельмі «цяжкі» цэх—мокрая апрэтура. Рабочыя не цікавіліся гутаркамі агітатараў. Мы пачалі падбіраць больш цікавыя тэмы, каб заахвоціць рабочых, і гэта нам удалося. Пачалі з міжнародных тэм. Устанавілася моцная дружба паміж рабочымі і агітатарамі.

Нашы агітатары прымацаваны да цэхаў. Яны карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод рабочых. Напрыклад, работніца прадзільнага цэха хацела перайсці на ўшчыльненую работу. Яна звярнулася па гэтаму пытанню не да галоўнага інжынера або дырэктара, а да агітатара.

Адмоўны бок нашай работы гэта адсутнасць плана. Мы пачалі праводзіць заняткі па гісторыі партыі, Канстытуцыі, але ў асноўным разбіраем бягучыя тэмы.

Недахопам у нашай рабоце з'яўляецца яшчэ тое, што не папоўніліся нашы рады агітатараў, а асталіся ўсе ранейшыя. Гэта тлумачыцца тым, што мы не сістэматычна працавалі з масай. У гэтым вялікая віна і наша, але большая віна падае на гарком партыі.

Я памятаю, калі тав. Кіркаешта і Раманаў 4 месяцы таму назад сабралі нараду агітатараў, мы сказалі, што неабходна ўвесці палітдні, што трэба даваць на прадпрыемствы добра падрыхтаваных дакладчыкаў на розныя тэмы, у першую чаргу на міжнародныя, каб людзі прывыкалі займацца і вучыцца. Указвалі таксама на неабходнасць сістэматычнага кіраўніцтва агіткалектывамі.

Тав. Раманаў на той нарадзе прызнаў нашы патрабаванні правільнымі, але да гэтага часу становішча чамусьці не змянілася.

Нас трэба было праінструктыраваць, каб мы ведалі, з чаго пачаць сваю работу. Вопыт работы агіткалектыва 3-га камбіната паказвае, што аддзелы прапаганды абкома і гаркома КП(б)Б не зрабілі яшчэ [illegible]нага ўпору на сістэматычную работу з агіткалектывамі.

Поспех выбараў будзе залежыць ад таго, як будзе весціся агітацыя і як будуць падрыхтаваны агітатары.

СКАРЫСТАЦЬ НАБЫТЫ ВОПЫТ АГІТАЦЫЙНАЙ РАБОТЫ

(З выступлення агітатара 1-га камбіната тав. Канопка).

Якую мы праводзім работу на камбінаце ў сувязі з выбарамі? Правялі ўжо некалькі сходаў па цэхах, гутаркі. Потым вылучылі людзей у акруговыя і ўчастковыя выбарчыя камісіі.

Рабочыя задаюць такія пытанні: «Чаму раней былі выбары ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР, а потым у мясцовыя Советы?» Мы ім гэта растлумачваем.

Цяпер выраслі мясцовыя людзі з асяроддзя актыва. Рабочыя заяўляюць, што совецкая ўлада за адзін год зрабіла больш, чым польская дзяржава за 20 год.

Падрыхтоўчая работа да выбараў у нас яшчэ разгорнута слаба. Гэта, я лічу, з'яўляецца недахопам работы нашай партыйнай арганізацыі.

У нас арганізавана некалькі гурткоў, але працуе толькі гурток па вывучэнню гісторыі партыі. У час выбараў трэба, каб гурткі працавалі нармальна. І тады ў нас вырасце лік агітатараў.

МАЛА ВЫБАРЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(З выступлення агітатара 25-й фабрыкі тав. Сальмана).

У нас шэсць тыдняў назад арганізаваліся гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі. У час абедзенага перапынку ў нас праводзіцца чытка газет, і заўсёды, вядома, узнікаюць розныя жыццёвыя пытанні. Але на фабрыцы вельмі мала літаратуры. З боку рабочых мы атрымоўваем за гэта папрок. Рабочыя цікавяцца жыццём народаў Совецкага Саюза.

Я працаваў пры выбарах у Народнае Сабранне, у час выбараў у Вярхоўныя Советы. Мы тады арганізавалі гурткі ў дамах, і акрамя таго часта збіралі выбаршчыкаў на ўчастку.

Неабходна, каб прыслалі нам Палажэнне аб выбарах на польскай, беларускай і яўрэйскай мовах. Кожны на сваёй роднай мове лягчэй усё зразумее.

Закончана стварэнне ўчастковых камісій

ГРОДНА. 31 кастрычніка. **(Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).** Закончана вылучэнне і зацвярджэнне кандыдатур ва ўчастковыя выбарчыя камісіі па Гродненскаму раёну. Створана 34 участкі. У камісіі працоўныя раёна паслалі сваіх лепшых прадстаўнікоў. Сяляне вёскі Агароднікі, Багушэўскага сельсовета, намеснікам старшыні камісіі вылучылі актывіста-бедняка Адама Ратэйка. Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені 17 верасня паслалі ў камісію свайго лепшага брыгадзіра Аляксея Говара, калектыў настаўнікаў жукавіцкай школы паслаў актывістку грамадскай работы настаўніцу Соф'ю Аплевіч.

Арганізацыйная работа закончана. Зараз выбарчая кампанія ў вёсках у поўным разгары. У раёне створана і працуе 34 агіткалектывы, у якіх налічваецца 783 агітатары. Так, напрыклад, у агіткалектыве Баранавіцкага сельсовета налічваецца 50 чалавек. Агітатары вышлі на ўчасткі. Яны праводзяць агітацыйна-масавую работу сярод выбаршчыкаў. У 712 створаных гуртках займаецца 9 тысяч чалавек.

Актыўна ўключылася ў выбарчую кампанію інтэлігенцыя сяла — настаўнікі, урачы, фельчары, аграномы. Цікава праводзяць свае заняткі настаўніца Багушэўскай школы тав. Федзько, урач верцялішскага медпункта тав. Рабіновіч, медыцынскі фельчар тав. Ваўкова і іншыя. Выбаршчыкі іх гурткоў з вялікай увагай слухаюць гутаркі аб магутнай краіне соцыялізма, аб мерапрыемствах партыі і ўрада па ўмацаванню абароназдольнасці СССР, аб выбарчым законе, Сталінскай Канстытуцыі.

* * *

Закончана таксама вылучэнне і зацвярджэнне кандыдатур ва ўчастковыя камісіі ў Саколкаўскім раёне. Створан 31 участак. У камісіях налічваецца 270 чалавек. 670 агітатараў разгарнулі сваю работу на сяле. 615 агітатараў без адрыву ад вытворчасці прайшлі пяцідзённыя курсы. Да правядзення курсаў быў прыцягнут актыў райкома партыі.

Г. Лупсякоў.

Складзены і вывешаны спіскі выбаршчыкаў

Актыўна рыхтуюцца да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных сяляне Шульбарскага сельсовета, Чыжаўскага раёна. На тэрыторыі сельсовета арганізавана 21 акруга па выбарах у сельскі совет дэпутатаў працоўных і 2 акругі па выбарах у раённы совет.

Зацверджан састаў акруговых выбарчых камісій. У акруговыя выбарчыя камісіі сяляне вылучылі лепшых людзей, апраўдаўшых сябе на практычнай рабоце. Гэта ў большасці новы вырасшы за апошні час актыў, які апраўдаў сябе на выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Сусед — агітатар вёскі Грындзіцы, Шыманская—член участковай выбарчай камісіі ў мінулых выбарах, Казлоўскі—былы батрак з вёскі Коскі.

Падабран і зацверджан агіткалектыў. 24 агітатары працуюць на тэрыторыі сельскага совета. З агітатарамі праведзен семінар па правядзенню гутарак аб XXIII гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі і аб пачатку выбарчай кампаніі. Кожны агітатар ведае сваю вёску, сваіх людзей.

Вялікую работу правялі агітатары тт. Юрчак, Міхайлоўская, Ераньзоў, Рэмжук і іншыя.

Агітатары расказалі сялянам аб Вялікай XXIII гадавіне Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, аб перамогах нашай краіны за 23 гады, аб міжнародным становішчы. Зараз прыступілі да вывучэння Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах.

Складзены і вывешаны спіскі выбаршчыкаў, агітатары ўдакладняюць правільнасць занясення грамадзян у спіскі выбаршчыкаў.

Н. Шашок.

Сяло рыхтуецца да выбараў

ГРАЕВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** У сяле Пшэходы ідзе падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Усюды адчуваецца вялікі ўздым. Прыступілі да работы выбарчыя камісіі і агітатары. У памяшканні школы, сельсовета, хаты-чытальні, пошты і кааперацыі развешаны выбарчыя плакаты і лозунгі. Сяло прымае ўрачысты выгляд.

Вечарамі ў сельсовеце і хаце-чытальні збіраецца многа народу, каб паслухаць агітатараў. Сакратар сельсовета тав. Кучынскі і актывісты сяла тт. Рушчык і Курмас пачалі складаць спіскі выбаршчыкаў.

Старшыня сельсовета тав. Драгун занят абсталяваннем памяшкання выбарчага ўчастка. З раённага цэнтра прывезены лозунгі, плакаты, літаратура. У памяшканне ўчастка дастаўлены крэслы, сталы і інш.

Асабліва вялікую работу праводзяць агітатары. У сельсовеце іх 45 чалавек. Усе яны прыступілі да работы. У сельсовеце працуе зараз 6 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Іх наведвае 215 — 220 выбаршчыкаў. Лік гурткоўцаў расце з кожным днём.

Добра працуе прапагандыст тав. Цывунчык. Днямі ён правёў гутарку на тэму: «Што дала совецкая ўлада працоўным раёна». Для гутаркі ён скарыстаў матэрыялы раённай выстаўкі, арганізаванай да гадавіны вызвалення працоўных заходніх абласцей Беларусі. У прыватнасці, ён указаў, што раней у раёне 24 памешчыкі мелі амаль 6 тысяч дзесяцін зямлі, а 3 тысячы бядняцкіх гаспадарак уладалі таксама 6 тысячамі гектараў. Зараз сяляне атрымалі 111 кароў, 172 кані і насенне. У раёне арганізавана тры калгасы і МТС.

У сяле Пшэходы цяпер ёсць свая школа, амбулаторыя, кааперацыя. У гэтых установах працуе больш 40 чалавек совецкай інтэлігенцыі. У сяле адчуваецца новае, радаснае жыццё.

В. Гарбанёў.



Праводзячы ў жыццё зварот глухаўцаў, калектыў беластоцкай табачнай фабрыкі загатовіў на зіму для сваёй сталовай 30 тон бульбы.

На здымку: рабочыя буртуюць бульбу. Фота А. Сапіра.

Забяспечыць насельніцтва горада гароднінай і бульбай

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Соўнарком Саюза ССР у сваёй пастанове аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў указалі, што мясцовыя партыйныя, совецкія і загатоўчыя арганізацыі нясуць поўную адказнасць за забеспячэнне насельніцтва гарадоў і прамысловых цэнтраў на асенні, зімовы і вясенні перыяды бульбай і гароднінай.

Ураджай гэтага года дае магчымасць забяспечыць працоўных горада ў дастатковай колькасці гароднінай і бульбай. Па даных абласнога Упраўлення Народнагаспадарчага ўліку, ураджай бульбы ў Беластоцкім раёне дасягае 200 цэнтнераў з гектара, капусты—30 цэнтнераў, а ў Граеўскім раёне ураджай капусты ў сярэднім дасягае да 500 цэнтнераў з гектара. Багаты ўраджай агуркоў, памідораў, морквы і іншых гароднінных культур.

Загатоўчыя і гандлюючыя арганізацыі спасылаліся на розныя прычыны і заяўлялі, што план загатоўкі бульбы не можа быць выканан. Аднак, калі горвыканком і гарком партыі катэгарычна патрабавалі ад іх сапраўднай перабудовы работы па загатоўках, план быў выканан на 102,5 процанта: трэба было загатовіць 11,625 тон бульбы, а завезена 11.912.

Дрэнна абстаіць справа з загатоўкай гародніны. Горхарчпромгандаль загатовіў капусты толькі 15 процантаў да плана, агуркоў—25 процантаў, памідораў—4,4 процанта, морквы—3,4 процанта. Грыбоў загатоўлена толькі 14,2 процанта, журавін — 13,3 процанта. Такое становішча кіраўнікі горхарчгандлю тт. Кіслік і Крымскі [illegible] аб'ясніць нічым не могуць. Не лепш справа абстаіць з загатоўкай гародніны ў трэсце кафэ і рэстаранаў.

Абласны будаўнічы трэст зацягвае будаўніцтва квасільнага пункта. Дырэктар трэста тав. Левін запэўніў, што будаўніцтва квасільнага пункта будзе закончана своечасова. Але ўсё гэта асталося на словах.

К. Чарнышоў.

Да зімы не гатовы

Асобныя прадпрыемствы Ломжынскага раёна дрэнна рыхтуюцца да работы ў зімовых умовах. Прывядзем некаторыя факты. Завод сельскагаспадарчых машын не забяспечан неабходнымі матэрыяламі. Цэхі завода знаходзяцца ў стадыі рэканструкцыі. Для поўнага заканчэння рамонту патрэбны такія будаўнічыя матэрыялы, як толь, чарапіца, але іх няма. Для ацяплення цэхаў тут складаюцца толькі праекты, не гледзячы на тое, што ўжо халады наступаюць.

Не лепшае становішча з падрыхтоўкай да зімы і на цагельным заводзе № 4. Сырагінай завод не забяспечан. Будуецца вузкакалейка ад кар'ера да завода, але калі будзе закончана яе будаўніцтва, невядома. Запасы паліва на заводзе таксама зусім нязначныя.

У верасні пасля капітальнага рамонту ўступіў у строй млынавы завод № 18. Складскімі памяшканнямі для хавання зярна завод не забяспечан. Паліва не загатоўлена.

Млыны горраймлынкамбіната таксама не падрыхтаваны да работы ў зімовыя месяцы. Паліва адсутнічае. Аб гэтым ведаюць кіраўнікі горраймлынкамбіната, аднак ніякіх мер не прымаюць да таго, каб знішчыць маючыяся недахопы.

Не падрыхтавана да зімы і арцель «Хімпраца». Яна мае сыравіны толькі на 15 дзён. Фактаў дрэннай падрыхтоўкі да зімы можна прывесці многа. Усе яны гавораць аб тым, што кіраўнікі прадпрыемстваў не ўлічылі ўрокаў мінулай зімы, не зрабілі для сябе адпаведных вывадаў.

П. Грышчанка.

М. Разбіралаў.

Наша армія, наша ўлада

Марыя Іванаўна Дз'ячук сядзіць за сталом у сваёй кватэры, некалі належаўшай аднаму з паслоў польскага сейма, і ўспамінае аб гістарычных днях 1939 года, калі працоўныя Заходняй Беларусі аднадушна праўзгаласілі совецкую ўладу. З таго часу прайшоў усяго толькі адзін год, а здаецца, што мінула дзесяцігоддзе — да таго непазнавальна стала зямля былых польскіх «усходніх крэсаў». Ды і ў самой Марыі Іванаўне Дз'ячук цяжка зараз пазнаць баязлівую прыслугу фабрыканта Трылінта ці прадзільшчыцу фабрыкі, належачай капіталісту.

Член Часовага ўпраўлення, дэпутат Народнага Сабрання, член Паўнамоцнай камісіі, загадчык бюро скарг аблвыканкома, нарэшце, дэпутат народа ў вышэйшы орган улады вялікай краіны соцыялізма—вось шлях прадзільшчыцы Беластока, пройдзены за такі кароткі адрэзак часу! Гэты шлях — лепшая ілюстрацыя к дасягненням совецкай улады ў заходніх абласцях БССР.

Год назад Народнае Сабранне Заходняй Беларусі абвясціла совецкую ўладу, іншага рашэння быць не магло. Не магло быць іншага рашэння таму, што 19 год позіркі працоўных польскіх усходніх калоній былі звернуты ў бок усхода сонца — у бок матутнай, роднай совецкай краіны. Здаецца, не праходзіла ні адной рэволюцыйнай даты, калі-б не праўзгалашаліся словы ў чэсць Совецкага Саюза, у чэсць таварыша Сталіна. Няма такіх лістовак, распаўсюджваемых сярод працоўных, у якіх-бы не змяшчаўся заклік да з'еднання народаў Заходняй Беларусі з адзінакроўнымі братамі БССР. Ні катарга, ні польскія шыбеніцы не змаглі запалохаць народ, які верыў, што Заходняя Беларусь будзе совецкай.

Вось чаму неперадаваемую радасць перажываў заходне-беларускі народ, калі данеслася вестка аб набліжэнні Чырвонай Арміі. Аб гэтым і ўспамінае тав. Дз'ячук.

— Калі нямецкія войскі занялі Беласток, я была ў маці на хутары Гнецюкі, паблізу Заблудава. У той час фабрыкі сталі, і ў Беластоку нечага было рабіць. На хутары стаяла цішыня: самалёты не кідалі бомб, толькі рассеяныя польскія войскі, якія хаваліся ў лясах, напаміналі аб вайне. Але я тут знаходзілася нібыта адрэзанай ад свету. Не было ні радыё, ні газет. Ні ад каго нельга было даведацца, што робіцца ў Польшчы, на франтах, у Беластоку. Невядомасць тахіла мяне. Я рашыла пайсці ў Заблудаў. Па дарозе ў вёску Гнецюкі я заўважыла нямецкага афіцэра з картай у руках, які растлумачваў штосьці стаўпіўшымся сялянам. Я падышла.

— Тут будуць Советы! — гаварыў афіцэр на ломанай польскай мове, паказваючы на карце Заблудаў.

Часцей і часцей забілася сэрца. Што такое я чую? Можа быць мне гэтыя словы толькі пачуліся?

Не, я не абслухалася. Сяляне с павесялеўшымі тварамі, асветленымі радасцю, ажыўлена абмяркоўвалі паведамленне аб тым, што Чырвоная Армія 17 верасня перайшла граніцу, накіроўваецца да Беластока, а нямецкія войскі, згодна дагавору, адыходзяць.

Значыць, Беласток будзе совецкім! З вёскі Гнецюкі я паспяшыла ў Беласток.

19 верасня ў горадзе прайшлі чуткі, што Чырвоная Армія ўжо заняла Ваўкавыск. Паток машын на вуліцах станавіўся ўсё радзей і радзей. Значыць, Чырвоная Армія зусім блізка. І ў гэты дзень група тэкстыльшчыкаў Беластока рашыла ісці на Ваўкавыскае шасе сустракаць совецкія войскі.

Мы нарвалі кветак, узялі чырвоныя сцягі і пайшлі за горад. Угляддаліся ў далечыню — ці не паказуцца перадавыя часці. Ажыўлена гутарылі аб прадстаячым будучым жыцці. Успаміналі, у каго хто з блізкіх жыве ў Совецкім Саюзе. Чакалі мы доўга. Але ў гэты дзень Чырвоная Армія не прышла. Мы з некаторым сумам звярнуліся дамоў, рашыўшы, што на наступны дзень напэўна нашых сустрэнем. Я не абгаварылася. Мы тады ўжо адкрыта, не таючыся, называлі Чырвоную Армію нашай. І не згаварваючыся, разумелі адзін аднаго, што **нашы** — гэта Чырвоная Армія, гэта совецкая ўлада.

На другі дзень хтосьці сказаў, што нашы могуць прысці ў Беласток з боку Гродна. Што-ж рабіць? Кожнаму хацелася першаму сустрэць чырвоныя войскі, засыпаць іх кветкамі, сказаць сардэчнае слова. Пасля спрэчак мы разбіліся на дзве групы, адна з якіх накіравалася на дарогу ў кірунку Гродна.

Тут мы пабудавалі арку, абвілі яе хвояй, кветкамі і чырвонымі сцягамі. Чакалі ўвесь дзень, але дарэмна. Нашы не паявіліся.

На трэці дзень — 21 верасня— мы вышлі за горад, цвёрда ўпэўненыя, што нашых сустрэнем. І сапраўды—хутка на шасе паказалася невядомая легкавая машына.

— Нашы едуць!!! — закрычалі ў натоўпе, які налічваў ужо чалавек 300. І мы паднялі букеты кветак.

Калі машына параўнялася з намі, мы ўбачылі ўсміхаўшыхся ваенных з чырвонымі звездачкамі на рукавах. Сумненняў не было — гэта ехалі прадстаўнікі Чырвонай Арміі. Цяжка апісаць наша захапленне. Не пералічыць колькасці паціскаў рук. Не перадаць, што гаварылася адразу ўсімі і кожным у паасобку. Машыну мы закідалі кветкамі. Хутка паказаліся машыны з байцамі. Гэта было трыумфальнае шэсце Чырвонай Арміі сярод захопленага ўдзячнага народа Заходняй Беларусі.

Гэта сустрэча гаворыць аб многім. Яна тлумачыць, чаму з выключным поспехам прайшлі выбары дэпутатаў працоўных у Народнае Сабранне. Зразумелым становіцца тое шчырае захапленне, натхненне, энтузіязм, з якім на Народным Сабранні сустракалася кожны раз вымаўляўшаеся імя Сталіна. Усе бачылі на вачах жанчын-дэпутатаў слёзы радасці. І калі дэпутатам Народнага Сабрання было пастаўлена пытанне:

— Якую прадстаўнікі народа жадаюць устанавіць уладу?

Увесь зал, не задумваючыся, хорам адказаў:

— Совецкую!

А калі падпісвалася Дэкларацыя аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў Совецкі Саюз, кожны дэпутат імкнуўся паставіць сваё імя першым. Я шчаслівая, што мне ўдалося падпісаць Дэкларацыю чацвертай. Гэтага я не забуду ўсё сваё жыццё!

* * *

Прайшоў год, і мы рыхтуемся выбіраць сваіх дэпутатаў у мясцовыя Советы. Вялікая радасць выбіраць і быць выбраным на аснове самай дэмакратычнай, Сталінскай Канстытуцыі. Няма сумнення, што ў мясцовыя Советы будуць пасланы людзі, адданыя справе партыі Леніна—Сталіна, верныя сыны і дочкі народа, дэпутаты непераможнага блока комуністаў і беспартыйных.

В. Арэф'эў.

Пісьмы ў рэдакцыю

Праявіць клопаты аб магілах паўшых герояў

У 1920 годзе ў час геройскіх схватак Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі з імперыялістычнай арміяй Пілсудскага загінулі ў Беластоку чырвоныя байцы, якія пахаваны ў брацкай магіле на ваенных могілках.

У час панавання польскай буржуазіі брацкая магіла чырвоных воінаў была поўнасцю запушчана. Настала пара падумаць аб тым, каб на магіле паўшых герояў паставілі мемарыяльную дошку.

Х. Унгер.

Забылі аб падручніках

У Цэханавецкай рускай сярэдняй школе вучні не забяспечаны падручнікамі. Кіраўнікі Беластоцкага абласнога аддзялення «КОГІЗ» і абласнога аддзела народнай асветы проста забылі аб тым, што ў г. Цэханаўцы існуе школа, і нічога не зрабілі, каб забяспечыць яе падручнікамі.

М. Вольн...

ЗА РУБЯЖОМ

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 1 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «З прычыны асабліва неспрыяючых метэаралагічных умоў англійская авіяцыя ўчора зусім бяздзейнічала. Нашы-ж самалёты па-ранейшаму працягвалі бамбардыроўку Лондана і іншых важных у ваенных адносінах аб'ектаў Паўднёвай, Цэнтральнай і Заходняй Англіі. У Бірмінгаме і ў паўднёвым прадмесці Брыстоля паспяховай бамбардыроўцы падвергліся важныя ваенныя заводы. Пры налёце на склады боепрыпасаў на захад ад Лондана некаторыя з іх узарваліся. Бамбардыроўкай выклікана крушэнне поезда. У час налёту на англійскія аэрадромы былі зарэгістрыраваны прамыя пападанні ў ангары, склады і сховішчы. На брыючым палёце нашы лётчыкі абстралялі з кулямётаў некалькі англійскіх самалётаў, якія знаходзіліся на адным аэрадроме, і прычынілі ім пашкоджанні. На захад ад Ірландыі нашай авіяцыяй патоплена англійскае транспартнае судно танажам каля 6 тысяч рэгістравых брута-тон. Ля паўднёва-ўсходняга ўзбярэжжа Англіі быў рассеян караван непрыяцельскіх суднаў. Адзначана некалькі прамых пападанняў, прычым адно судно, даўшы моцны крэн, вымушана было застанавіцца. Над заходнім узбярэжжам Нарвегіі ў паветраным баі было збіта 2 непрыяцельскіх самалёты. Германская авіяцыя страт не мела».

БЕРЛІН, 1 лістапада. Як паведамляе германскае інфармацыйнае бюро, учора ў адным з гарадоў Паўднёвага ўзбярэжжа Англіі, у рэзультаце ўзрываў бомб паблізу вакзала, загарэлася некалькі пакгаузаў. Пажар хутка перакінуўся на іншыя аб'екты. Бамбардыроўцы падвергся таксама аэрадром паблізу Бірмінгама, на якім пашкоджана некалькі ангараў і будынкаў.

У Лондане ў рэзультаце бамбардыроўкі ўспыхнулі пажары і адбыліся ўзрывы ў раёне Сіці. У паўднёва-заходняй частцы горада цяжка пашкоджаны збудаванні аднаго буйнага завода. Многа бомб было скінута з брэючага палёту на аэрадром, размешчаны на поўнач ад Лондана. Ёсць асновы меркаваць, што каля 30 непрыяцельскіх самалётаў выведзена з строя.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 1 лістапада. Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ўчора да поўдня германская авіяцыя праяўляла нязначную актыўнасць. Пасля поўдня германскія самалёты зрабілі налёт на розныя пункты краіны, аднак матэрыяльны ўрон нязначны.

Уночы непрыяцельскія самалёты скінулі бомбы ў некаторых раёнах краіны.

Англійская авіяцыя ў ноч на 31 кастрычніка бамбардыравала акупіраваныя Германіяй парты Флісінген, Антверпен і германскі порт Эмдэн. Многа бомб было скінута на Вальхарэм, дзе ўзніклі буйныя пажары.

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, італьянская падводная лодка знішчыла 30 кастрычніка частку механічных падводных сецей, якія забаранялі ўваход у Гібралтарскую гавань, і захавалася. Пашкоджаная сетка была адрамантавана. Учора раніцой пад канвоем ваенных караблёў і самалётаў з Гібралтара вышла 63 гандлёвых судны.

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. Як перадае агенцтва Юнайтэд Прэс, іспанскае агенцтва Менчэта паведамляе, што паблізу Ла Лінеа на беразе знойдзена судно дзіўнай формы, прадстаўляючае сабой камбінацыю тарпеды і кацера. Даўжыня судна — 10 футаў. Яно мае рулявое ўпраўленне, прапелер, тормаз, бензінавы матор, які яшчэ дзейнічаў, калі судні было знойдзена. Судно аднамясцовае. Наглядальнікі лічаць, што гутарка ідзе, напэўна, аб упраўляемай тарпедзе.

Экспарт амерыканскіх бамбардыровачных прыцэлаў у Англію

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Інтэрнейшэнэл ньюс сервіс, прадстаўнік міністэрства фінансаў ЗША заявіў, што ваеннае міністэрства дазволіла экспарт у Англію сакрэтнага бамбардыровачнага прыцэла. Аддзел друку ваеннага міністэрства адмовіўся пацвердзіць гэта паведамленне. Высокапастаўленыя асобы марскога міністэрства ў прыватным парадку пацвердзілі.

Вайна на моры

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Бастона, пасажыры прыбыўшага з Дальняга ўсхода парахода заявілі, што германскі ваенны карабель патапіў у паўднёвай частцы Індыйскага акіяна 5 англійскіх параходаў і 1 грэчаскі.

АРЫШТ ДЖАВАРХАРЛАЛА НЕРУ

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе аб арышце віднага лідэра індыйскага нацыянальнага кангрэса Джавархарлала Неру. Ён быў затрыман у той момант, калі накіроўваўся ў Варду пасля спаткання з Гандзі.

РОСТ ДАРАГАВІЗНЫ Ў ФІНЛЯНДЫІ

СТАКГОЛЬМ, 1 лістапада. (ТАСС). Па даных газеты «Афонбладэт», агульная каштоўнасць жыцця ў Фінляндыі ўзрасла ў параўнанні з 1939 годам на 40 процантаў. Плата за апальванне і асвятленне за тэты-ж тэрмін павялічылася на 113 процантаў.

Грэка-Італьянская вайна

БЕРЛІН, 1 лістапада. Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, у Італіі апублікаван дэкрэт Мусаліні, які аб'яўляе італьянскія правінцыі: Глінокстэр, Корца, Корча, Берас, Валона, Эльбасан, Тірана, Дурэйс (Дурацо) і ўчастак узбярэжжа паміж вусцямі рэк Бояна і Мат раёнам ваенных аперацый, на які распаўсюджваюцца адпаведныя распараджэнні.

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, грэчаскія лёгкія бамбардыроўшчыкі атакавалі італьянскія транспартныя калоны і войскі, якія ішлі па дарозе ўздоўж узбярэжжа Іонічаскага мора. Італьянцы спрабуюць прасунуцца па даліне ракі Кальмас к Яніне.

Бамбардыроўцы падвергліся таксама італьянскія базы забеспячэння, асабліва ў раёне Мертсекі.

АФІНЫ, 1 лістапада. Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае наступную зводку вярхоўнага камандавання грэчаскіх узброеных сіл, датыраваную ўвечары 31 кастрычніка: «У раёне Эпіра аперацыі пяхоты і танкаў праціўніка былі паўсюды адбіты. Праціўнік панёс страты. Намі ўзяты палонныя. У супрацоўніцтве з войскамі праціўніка дзейнічалі нерэгулярныя атрады. Учора наша авіяцыя падвергла бамбардыроўцы і кулямётнаму абстрэлу воінскія часці праціўніка. У паветраным бай 1 непрыяцельскі самалёт быў збіт, другі пашкоджан. Наш самалёт вымусіў да бегства разведчы самалёт праціўніка, якому пры праследванні былі прычынены пашкоджанні. Нашы марскія сілы паспяхова бамбардыравалі звыш часа правы фланг праціўніка».

(ТАСС).

—o—

СТАНОВІШЧА Ў ФРАНЦЫІ

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, Пэтэн выдаў дэкрэт аб роспуску ўсіх советаў пры губернатарах французскіх калоній і значным узмацненні ўлады губернатараў. Дэкрэт накіраван супроць староннікаў генерала дэ Голя. Міністр унутраных спраў Пейрукэў звольніў 64 супрацоўніка паліцыі, часова адстараніў ад пасады 101 чалавека і панізіў па пасадзе 112 чалавек.

НЬЮ-ЙОРК, 1 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, французскі ўрад выдаў дэкрэт аб нарміраванні продажу харчавання ў зімовы час. Створан спецыяльны камітэт для кантролю над размеркаваннем харчавання і вышукання заменнікаў харчовых прадуктаў. Выдан загад аб рэгістрацыі ўсіх урачоў. Гэта мера прымаецца на выпадак распаўсюджання эпідэмій, а таксама з мэтай вызвалення ад работы ўрачоў-яўрэяў. Вывучаецца магчымасць прымянення ў якасці заменнікаў харчавання жолудаў, крапівы, карэнняў і іншага.

Нарада палітасветработнікаў

У Беластоку адбылася нарада палітасветработнікаў заходніх абласцей БССР. На працягу трох дзён на нарадзе абмяркоўвалася становішча палітасветработы і задачы палітасветработнікаў у кампаніі па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

На нарадзе быў заслухан даклад начальніка ўпраўлення палітасветработы Наркамасветы БССР тав. Мысляўца.

— Работа ў палітасветустановах,—гаворыць тав. Мыслявец, — павінна быць накіравана ў першую чаргу на выхаванне новых соцыялістычных адносін да працы, да дзяржаўнай і грамадскай уласнасці, любві да радзімы, патрыятызма і пачуцця інтэрнацыяналізма.

У рабоце палітасветустаноў заходніх абласцей Беларусі ёсць рад буйных недахопаў. Напрыклад, стварэнне новых устаноў, прадугледжаных планам, праходзіць вельмі марудна. Асабліва слаба пастаўлена стварэнне палітасветустаноў у Беластоцкай вобласці. Дамы соцкультуры і хаты-чытальні размешчаны часта ў неадпавядаючых памяшканнях. Дрэнна абстаіць справа з кадрамі, адчуваецца вялікі недахоп у падрыхтаваных работніках хат-чытален.

У перыяд выбараў Дамы соцкультуры і хаты-чытальні павінны стаць сапраўднымі цэнтрамі агітмасавай работы сярод насельніцтва. У сувязі з тэтым неабходна правесці з загадчыкамі і работнікамі Дамоў соцкультуры і хат-чытален спецыяльны семінар, аформіць і ўпрыгожыць палітасветустановы лозунгамі і плакатамі на выбарчыя тэмы, абсталяваць сталы даведак.

Выступіўшыя па дакладу работнікі расказалі аб сваіх дасягненнях, а таксама аб цяжкасцях, якія сустракаюцца ў іх рабоце. У раёнах, напрыклад, адчуваецца вялікі недахоп літаратуры на польскай мове.

— Работа ў Снядаўскім раёне пастаўлена нядрэнна,—гаворыць палітасветінспектар Снядаўскага раёна тав. Паталоўскі.—У кожным сельсовеце ёсць хата-чытальня, створаны тры сельскіх бібліятэкі і адна раённая. Падабраны кадры палітасветработнікаў з мясцовага насельніцтва. За апошні квартал палітасветустановы правялі 204 даклады, 49 гутарак і 43 вечары мастацкай самадзейнасці. Пры хатах-чытальнях працуюць гурткі МОПР'а. Зараз у Снядаве заканчваецца будаўніцтва новага вялікага Дома соцкультуры.

Начальнік бібліятэчнага ўпраўлення Наркамасветы БССР тав. Злоцін у сваім выступленні правільна падкрэсліў, што неабходна, нарэшце, навесці парадак з укамплектаваннем бібліятэк кнігамі, асабліва на польскай мове. Трэба лічыцца з тым, што не так хутка можна ажыццявіць новыя выданні. Таму трэба неадкладна сабраць усе маючыяся выданні на польскай мове і з толкам карысць з іх—накіраваць у раёны.

Інспектар Наркамасветы БССР па школах для дарослых тав. Жынко заклікаў палітасветработнікаў звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на барацьбу з непісьменнасцю. Трэба так пабудаваць зараз работу па ліквідацыі непісьменнасці, каб у дзень выбараў выбаршчык сам мог прачытаць выбарчы бюлетэнь. З гэтай мэтай неабходна мабілізаваць на месцах усіх пісьменных людзей.

На нарадзе выступіў таксама сакратар Беластоцкага абкома партыі тав. Сямёнаў.

— Перад палітасветустановамі ў бягучай выбарчай кампаніі,—сказаў тав. Сямёнаў,—стаяць велізарнейшыя задачы. Вось, напрыклад, толькі ў Беластоцкай вобласці трэба выбраць 10.650 дэпутатаў. Палітасветустановы павінны правесці велізарную агітацыйную работу, і гэта агітацыя павінна быць мэтанакіраванай і змястоўнай. Трэба расказаць масам аб міжнародным становішчы, аб сучаснай імперыялістычнай вайне, аб мірнай палітыцы Совецкага Саюза, растлумачыць, што, калі нават зараз адчуваем некаторыя цяжкасці, — гэта толькі часовая з'ява, звязаная з тым, што наш урад асноўную ўвагу звяртае на ўмацаванне абараназдольнасці сваёй краіны.

Расказваючы працоўным аб поспехах, якіх дабіўся Совецкі Саюз за 23 годы, і аб дасягненнях заходніх абласцей БССР за год існавання совецкай улады, трэба падкрэсліць і паказаць на прыкладах, на што здольны народ, калі ён працуе не на эксплаататараў, а на сваю ўласную дзяржаву. Прыклад гэтага—будаўніцтва Днепра-Бугскага канала. Тое, што польскі ўрад не стварыў на працягу двух дзесяцігоддзяў, совецкі ўрад зрабіў за 6 месяцаў.

Затым слова ўзяла загадчык сектара культуры і мастацтваў ЦК КП(б) тав. Аблавацкая. —Палітасветнікі павінны памятаць, што палітасветустановы—гэта масавыя ўстановы. Асноўныя задачы палітасветработнікаў—даводзіць да свядомасці шырокіх мас мерапрыемствы партыі і ўрада.

Мастацкую самадзейнасць і работу гурткоў трэба арганізаваць так, каб іх работа была цікавай. Не абходна дабіцца таго, каб рабочы або селянін мог у Доме соцкультуры ці ў хаце-чытальні сапраўды культурна правесці свой адпачынак.

Дырэктар беластоцкага Дома народнай творчасці тав. Бейлінаў спыніўся на задачах мастацкай самадзейнасці ў перыяд выбарчай кампаніі.

Падводзячы вынікі нарады, намеснік наркома асветы БССР тав. Чарноў падкрэсліў неабходнасць стварэння шырокага актыва пры кожнай хаце-чытальні. На службу антырэлігійнай прапагандзе трэба паставіць фізіку, хімію і іншыя навукі. Трэба навукова і абгрунтавана паказаць працоўным, што рэлігія заўсёды дапамагала і служыла на карысць капіталістаў і памешчыкаў.

У прывітальнай тэлеграме, пасланай на імя таварыша Сталіна, палітасветработнікі ўрачыста абяцаюць у самы кароткі тэрмін ператварыць палітасветустановы заходніх абласцей БССР у сапраўдныя ачагі комуністычнага выхавання, арганізаваць палітыка-выхаваўчую работу сярод працоўнага насельніцтва, па-большэвіцку праводзіць агітацыю за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Б. Масенжнік.



У 1-й польскай сярэдняй школе гор. Беластока актыўна працуе палітгурток, якім кіруе комсорг тав. Зуева. На здымку: Зуева, члены гуртка: вучань дзесятага класа Георгій Андрасюк, вучаніцы VI-га класа Міхаліна Міснюкова і Ванда Педзік.

Фота А. Сапіра.

Вучнёўскі камітэт у школе

Нядаўна ў школах нашай вобласці закончыліся выбары вучнёўскіх камітэтаў. У іх састаў увайшлі лепшыя вучні, якія карыстаюцца аўтарытэтам у таварышоў. З першых дзён добра разгарнулі сваю работу вучнёўскія камітэты беластоцкіх школ 9-й, 10-й, 8-й, 3-й і 1-й. Вучкомы гэтых школ узначалілі перадкастрычніцкае спаборніцтва вучняў, сталі сапраўднымі памочнікамі настаўнікаў.

Поспех у рабоце вучкома будзе залежаць ад таго, наколькі вучком зможа згуртаваць вакол сябе працаздольны актыў, як ён сумее арганізаваць спаборніцтва вучняў на лепшую вучобу і выдатную дысцыпліну. Пасяджэнні вучкома, сходы актыва павінны склікацца па важнейшых пытаннях школьнага жыцця (праверка ходу соцспаборніцтва, паспяховасць якога-небудзь класа, стан гуртковай работы, падрыхтоўка масавых мерапрыемстваў і інш.).

Важнейшае месца ў рабоце вучкома павінна заняць арганізацыя таварыскай узаемадапамогі. Вучкомы павінны прывіваць таксама працоўныя навыкі вучням. Вучком можа, напрыклад, наладзіць выраб некаторых вучэбна-наглядных дапаможнікаў для школы.

Вучкомы могуць адыграць немалую ролю і ў арганізацыі мастацкай самадзейнасці. Гурткі, экскурсіі, літаратурныя і навуковыя вечары — усё гэта павінна знайсці сваё адлюстраванне ў рабоце вучкома.

Работа вучкома павінна ўзгадняцца з кіраўніцтвам школы, з работай комсамольскай і піонерскай арганізацый і праводзіцца па строгаму плану.

А. Фрыдлянд,
інструктар аддзела школ і піонераў абкома комсамола.

РАСЦЕ ГАРАДСКАЯ ГАНДЛЁВАЯ СЕТКА

На ўскраінах горада Беластока заканчваецца будаўніцтва трох новых памяшканняў пад харчовыя магазіны. Акрамя таго, рамантуецца рад старых гандлёвых памяшканняў.

Усяго ў горадзе да свята адкрыецца 5 новых харчовых магазінаў, 2—хлебных і 3—промтаварных.

Нам. адказнага рэдактара
Г. М. КУЗНЯЦОЎ.

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-82.

... 88. Тыраж — 10.000 экз. Друкарня Беластокдрук